# Мінсувязі выпускае ў абарачэнне канверт з арыгінальнай маркай «30-годдзе ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Азербайджанскай Рэспублікай»

2 чэрвеня 2023 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне канверт з арыгінальнай маркай «30-годдзе ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Азербайджанскай Рэспублікай».

Мастак Т. Дольская. Дызайн С. Цырулік.

Дыпламатычныя адносіны паміж Рэспублікай Беларусь і Азербайджанскай Рэспублікай усталяваны 11 чэрвеня 1993 года.

Адным з найважнейшых дасягненняў з'яўляецца вывад двухбаковых адносін на ўзровень стратэгічнага партнёрства.

Паміж краінамі ідзе інтэнсіўны палітычны дыялог. Актыўнае міждзяржаўнае ўзаемадзеянне на вышэйшым узроўні дапаўняюць міжпарламенцкія сувязі. Парламентарыі дзвюх краін усяляк садзейнічаюць паглыбленню адносін у гандлёва-эканамічнай, культурнай, навуковай, адукацыйнай і іншых галінах.

Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Пасольствам Рэспублікі Беларусь у Азербайджанскай Рэспубліцы.

Спецыяльныя памятныя гашэнні будуць праводзіцца 12 чэрвеня на паштамце Мінска і ў Баку (Азербайджан).

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/30-05-2023-8505*